Весці БДПУ. Серыя 2. 2023. № 4. С. 88–94

УДК 94(476)1921/1939

# «КАЦІНЫЯ СПЕВЫ»: ПАЛІТЫЧНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ ВУЧНЯЎ БЕЛАРУСКІХ ГІМНАЗІЙ У МІЖВАЕННАЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

**К. Д. Ананька,**
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы*

Паступіў у рэдакцыю 06.04.2023.

UDC 94(476)1921/1939

# «CAT CHANTS»: POLITICAL ACTIVITY OF STUDENTS OF BELARUSIAN GYMNASIUMS IN INTERWAR WESTERN BELARUS

**K. Ananka,**
*postgraduate student of the Department of History of Belarus, Archeology and Special Historical Disciplines of Yanka Kupala State University of Grodno*

Received on 06.04.2023.

Апынуўшыся ў Заходняй Беларусі, якая пасля 1921 г. увайшла ў склад польскай дзяржавы, беларускі нацыянальны рух пачаў развіваць новыя формы і метады дзейнасці. З мэтай захавання мовы і культуры інтэлігенцыя перайшла да шырокага ўтварэння беларускай нацыянальнай адукацыі шляхам арганізацыі беларускіх навучальных устаноў. Гімназіі сталі асноўнымі месцамі падрыхтоўкі беларускіх нацыянальных кадраў з-за высокай свядомасці іх вучнёўскага кантынгенту. У артыкуле раскрываецца аспект палітычнага руху моладзі ў Віленскай, Навагрудскай, Радашковіцкай і Клецкай беларускіх гімназіях. На аснове аналізу ўспамінаў і справаздач польскіх паліцэйскіх органаў аўтар вызначыў асноўныя формы палітычнай актыўнасці навучэнцаў, дзякуючы якім роля беларускіх гімназій стала адной з асноўных у беларускім нацыянальным руху міжваеннай Польшчы. У высновах даецца перыядызацыя, якая абгрунтоўвае пераход вучнёўскай дзейнасці ад цалкам легальных да вельмі радыкальных формаў барацьбы з польскімі ўладамі. Галоўным фактарам такога пераходу стала пранікненне левper радыкальнай ідэалогіі ў сцены гімназіі, якая прыцягнула шырокае кола кантынгенту разглядаемых устаноў.

*Ключавыя словы:* беларускія гімназіі, Заходняя Беларусь, міжваенны перыяд, палітычная актыўнасць, вучні.

In Western Belarus, which became a part of the Polish state after 1921, Belarusian national movement began to develop new forms and methods of activity. In order to preserve the language and culture, the intelligentsia moved to extensive education of the Belarusian national education through the organization of Belarusian educational institutions. Gymnasiums became the main places of training of the Belarusian national cadres because of the high consciousness of their student contingent. The article reveals the aspect of the political movement of young people in Vilna, Novogrudok, Radoshkovichi and Kletsk Belarusian gymnasiums. On the basis of the analysis of memoirs and reports of Polish police authorities the author has determined the main forms of students' political activity, thanks to which the role of Belarusian grammar schools became one of the major ones in Belarusian national movement of inter-war Poland. The conclusions provide a periodization justifying the transition of student activity from quite legal to extremely radical forms of struggle against the Polish authorities. The main factor in this transition was the penetration of left-radical gymnasium ideology, which attracted a wide range of the contingent of the institutions in question.

*Keywords:* Belarusian gymnasiums, Western Belarus, interwar period, political activity, students.

*Уводзіны.* У сучаснай беларускай гістарыяграфіі тэма вучнёўскай палітычнай актыўнасці ў гімназіях не раскрыта ў поўнай ступені. Напрыклад, беларускія даследчыкі А. М. Вабішчэвіч [5; 6] і У. В. Ляхоўскі [14; 15] у большай ступені не абапіраліся на эга-дакументы, каб падкрэсліць дэталі тых ці іншых падзей. Аднак у іх даследаваннях падкрэсліваецца высокі ўзровень пранікнення леварадыкальных у гімназічнае асяроддзе. Былыя навучэнцы беларускай гімназіі ў Вільні І. Бурсевіч [3], М. Бурсевіч [4], З. Коўш [13], Я. Шутовіч [18], Я. Міско [19] з'яўляліся непасрэднымі сведкамі і ўдзельнікамі тагачасных падзей. Ва ўспамінах утрымліваюцца звесткі пра дзейнасць камсамольскіх структур, згадваюцца некаторыя вучні-актывісты, а таксама апісваюцца дэталі палітычных выступленняў і іх наступствы. Былы навучэнец гімназіі ў Навагрудку А. Анішчык, вядомы пад псеўданімам А. Чэмер, яшчэ ў 1990-я гг. зрабіў спробу скласці своеасаблівы летапіс сваёй былой навучальнай установы. Факты з успамінаў пацвярджаюцца дакументамі і справаздачамі польскай адміністрацыі [21] і паліцэйскіх органаў з фондаў абласных архіваў у Брэсце [7–11] і Гродне [12], Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва [2].

*Асноўная частка.* Ад пачатку існавання Віленскай беларускай гімназіі (ВБГ) з 1919 г. значная частка вучняў старшых класаў прымалі ўдзел у сходах Грамады беларускай моладзі, што можна лічыць як першы відавочны прыклад дзейнасці ў грамадскім жыцці. З сакавіка 1921 г. у гімназіі з ініцыятывы вучняў пачаў дзейнічаць уласны гурток са сваёй структурай і статутам. Удзельнікамі сталі ў большай ступені навучэнцы 8 класа. Друкаваным органам стаў штомесячны часопіс «Маладое жыццё», першы нумар якога выйшаў яшчэ 14 лютага 1921 г.

(усяго выйшла 7 нумароў). Галоўнай мэтай існавання гуртка стала ўсебаковае адраджэнне беларускага народу на падставе духоўнага развіцця, маральнага і фізічнага выхавання, кансалідацыі моладзі Заходняй Беларусі. Ужо восенню 1921 г. па прычыне выпуску большасці сябраў дзейнасць гуртка і выданне часопіса была спынена [14, с. 269–270].

У пачатку 1920-х гг. у сценах гімназіі панавала атмасфера палітычнай стрыманасці. Былы вучань Я. Шутовіч, які вучыўся ў ВБГ у 1919–1924 гг., характарызаваў тагачасную палітычную сітуацыю ў сценах гімназіі наступным чынам: «Трэба сказаць, што ў тым часе майго прабывання ў гімназіі панавала нейкая асаблівая атмасфера з усеагульнай нацыянальнай, адначасна патрыятычнай салідарнасці. Беларускія дзеячы розных палітычных напрамкаў мелі супольны язык, былі у адносінах узаемнага пашанавання» [18, арк. 11]. Ужо пасля ўтварэння Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) у 1923 г. навучэнцы старшых класаў гімназій уключаліся ў яе дзейнасць. Прыкладна ў 1923–1924 гг. вучань 6 класса ВБГ А. Канчэўскі ўваходзіў у склад ЦК КПЗБ. Яшчэ ў пачатку 1924 г. пры ўдзеле КПЗБ пачалося таемнае стварэнне Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ або камсамол). Створаныя ў вялікай колькасці ў гарадах, мястэчках і вёсках камсамольскія ячэйкі ўспрымаліся як найбліжэйшы рэзерв камуністычнага падполля. Таварыства беларускай школы (ТБШ), якое кіравала функцыянаваннем беларускай нацыянальнай адукацыі, з цягам часу стала своеасаблівым правадніком леварадыкальных ідэй [14, с. 245–247].

Вялікі ўплыў на палітычную свядомасць навучэнцаў беларускіх гімназій адыгрывала палітычная партыя Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ), якая дзейнічала ў 1925–1927 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Функцыянаванне палітычных структур БСРГ падтрымлівалася з боку КПЗБ. Некаторыя з педагогаў беларускіх гімназій былі членамі БСРГ, распаўсюджваючы пры гэтым палітыку арганізацыі на сваіх занятках [3, с. 140]. Напрыклад, настаўнік спеваў і выхаваўца ў інтэрнаце ВБГ Р. Шырма часта абмяркоўваў з навучэнцамі рускую і савецкую літаратуру, рэвалюцыйныя падзеі і іншыя падобныя рэчы. Як успамінаў Я. Міско: «…Шырма не раз гутарыў з намі пра Леаніда Андрэева, пра Крапоткіна, пра тургенеўскіх “Отцы и дети”, пра народнікаў, пра Леніна» [19, арк. 22].

Метады ідэйных выступленняў у сценах гімназій былі разнастайнымі: ад публічных лозунгаў і спеваў («КИМ, бей по разрухе» «Даеш Варшаву», «Ад веку мы спалі» і інш.) да фізічнага супрацьстаяння з польскай паліцыяй [13, с. 36]. У студзені 1927 г. польскія ўлады прынялі рашэнне аб палітычнай барацьбе супраць БСРГ, якое пачалося з масавых арыштаў яе кіраўніцтва і актывістаў. Менавіта гэтыя падзеі абумовілі трансфармацыю грамадска-палітычнай зацікаўленасці вучняў і іх уключэнне ў палітычную павестку. Першапачатковае адлюстраванне вучнёўскай актыўнасці знаходзілася ў культурна-асветніцкай дзейнасці. У сценах навучальных устаноў вучні ладзілі літаратурныя сустрэчы і вечары мастацкай самадзейнасці, арганізоўвалі вучнёўскія гурткі, займаліся выпускам часопісаў і насценгазет [19, арк. 22]. Напрыклад, у ВБГ гурткоўцы займаліся выпускам часопісаў «Наперад» і «Золак», у якіх праяўляліся вучнёўскія палітычныя матывы і погляды.

Публікацыі твораў у часопісах і газетах, якія выдаваліся самімі навучэнцамі, магчыма, сталі першай формай палітычнай актыўнасці. Напрыклад, у вучнёўскім літаратурным часопісе «Зорка», які выдаваўся ў ВБГ у першай палове 1920-х гг., у нумары ад 20 лістапада 1922 г. быў апублікаваны верш «Досыць спаць», які заклікаў да барацьбы за свабоду [16, с. 283]. Часцей за ўсё такія творы былі ананімнымі альбо публікаваліся пад псеўданімамі. Да канца 1920-х гг. адбывалася тэндэнцыя радыкалізацыі зместу вучнёўскіх публікацый. У 1928 г. В. Таўлай пад псеўданімам «Янка Дванаццаты» апублікаваў частку сваёй паэмы «Непераможная» ў нумары вучнёўскага часопіса «Золак» па прычыне разгрому БСРГ [19, арк. 26]. Вынікам такой дзейнасці станавіліся забароны выданняў з боку адміністрацыі гімназіі і роспуск рэдакцыйнай калегіі, таму часцей за ўсё больш за 1–2 нумары не выходзіла.

Некаторыя вучні гімназій актыўна ўдзельнічалі ў вулічных дэманстрацыях, распаўсюджвалі лістоўкі і адозвы, працавалі ў якасці кур’ераў. У тым жа 1927 г. пасля польскіх паліцэйскіх налётаў і арыштаў актыву Грамады групы гімназістаў у Вільні прынялі ўдзел каля Стэфанаўскай і Лукішскай турмах, на вуліцы Св. Ганны і іншых. Часцей адказнасць за арганізацыю падобных дэманстрацый браў гарадскі камітэт КПЗБ. Былы навучэнец ВБГ М. Бурсевіч апісваў удзел вучняў так: «…ва ўмоўлены час на тратуарах з’яўлялася ўсё больш і больш прахожых. У гэты момант усе спяшаліся на вуліцу, хутка строіліся ў рады. У гушчы людзей, над іх галовамі, высока ўзнімаўся на дрэўку чырвоны сцяг. Пачынала гучаць баявая песня, часцей за ўсё “Інтэрнацыянал”. У прамежках паміж мелодыямі дэмастранты дружна выкрыквалі лозунгі. Над галовамі ўзляталі лістоўкі. Кожная з гэтых дэманстрацый заканчвалася налётамі моцных атрадаў коннай і пешай паліцыі» [4, с. 135]. У Радашковіцкай беларускай гімназіі (РБГ) 10 сакавіка 1927 г. прайшла вучнёўская забастоўка па ініцыятыве аднаго з гімназічных гурткоў. Пасля яе быў наладжаны збор сродкаў

з мэтай дапамогі палітычным зняволеным [5, с. 69]. 27 снежня 1929 г. на пахаваннях беларускага грамадскага дзеяча і члена ТБШ Ю. Юхны адбылася палітычная маніфестацыя, якая прывяла да сутыкнення з паліцыяй [1, с. 4]. Пасля гэтай падзеі было арыштавана 46 удзельнікаў пахаванняў, сярод якіх былі 6 вучняў 5 і 6 класаў ВБГ.

Падазраванымі па судовай справе БСРГ праходзілі ў тым ліку былыя і дзеючыя супрацоўнікі гімназіі – кіраўнік ВБГ Р. Астроўскі, былы дырэктар Б. Тарашкевіч, настаўнік праваслаўнага Закона Божага А. Коўш і іншыя. Аднак у выніку судовага рашэння Р. Астроўскі і А. Коўш змаглі пазбегнуць крымінальнай справы, у той самы час, калі іншым значным фігурантам далі вялікія тэрміны турэмнага зняволення. Гэтая акалічнасць паўплывала на пераарыентацыю палітычнага курсу перш за ўсё Р. Астроўскага да збліжэння і супрацоўніцтва з польскімі ўладамі, што ў сваю чаргу падрывала яго аўтарытэт і абумовіла абурэнне многіх навучэнцаў гімназій. Менавіта гэтым можна растлумачыць радыкалізацыю дзеянняў і масавае ўступленне ў камсамольскія арганізацыі пад куратарствам КПЗБ, разгарнуўшы палітычную актыўнасць унутры устаноў. Асноўным кантынгентам камсамольскіх арганізацый сталі прыезджыя з іншых населеных пунктаў дзеці сялянскага паходжання. Таму прыналежнасць да бедных слаёў насельніцтва абумовіла негатыўныя адносіны да вучняў заможных бацькоў.

Аснова функцыянавання структуры КПЗБ у сценах гімназій складалася ў стварэнні своеасаблівага павуціння – практычна ў кожным класе ствараліся камсамольскія арганізацыі. Адным з фігурантаў стварэння ячэек у Клецкай беларускай гімназіі (КБГ) стаў вучань 5 класа І. Лойка. У 4 класе намаганнямі А. Жыткевіча таксама была ўтворана арганізацыя, у якую ўвайшлі яшчэ 6 чалавек. Па заданнях кіраўнікоў сябры ячэек павінны былі ствараць падпольныя арганізацыі ў сваіх родных населеных пунктах у Нясвіжскім і Баранавіцкім паветах. Да 1928–1929 гг. у сценах КБГ існавала 15 падпольных камсамольскіх арганізацый, што агульна складала каля 60 чалавек (па 3–5 у кожнай) [17, с. 30]. Пры гэтым выкарыстоўвалася строгая канспірацыя і відавочны недавер да чужых элементаў [10, арк. 12–13].

Значная колькасць навучэнцаў-камсамольцаў была ўцягнута ў дзейнасць Міжнароднай арганізацыі дапамогі рэвалюцыянерам (МОПР). Часцей за ўсё яны выконвалі функцыі кур’ераў. Былы вучань ВБГ І. Бурсевіч успамінаў: «Мне прыходзілася самому выконваць з групай іншых вучняў заданні па лініі МОПРа. Нас выкарыстоўвалі для рэгулярнай перадачы прадуктовых пасылак і часопісаў палітзняволеным у Стэфанаўскай і Лукішскай турмах. Асабліва гэта работа была ўскладзена на вучняў пасля разгрому Грамады, калі былі праведзены вялікія арышты сярод яе актыву…». Нярэдка гімназістам прыходзілася асабіста дамаўляцца з работнікамі турмы, а таксама «выносіць» з рэдакцыі канфіскаваныя нумары часопісаў яшчэ да таго, як іх забяруць цэнзурныя органы [3, с. 141]. Кур’ерскай дзейнасцю займаліся рэгулярна – раз у тыдзень па чарзе [19, арк. 22].

У 1928 г. польскія ўлады пачалі звяртаць увагу на палітычную актывізацыю навучэнцаў у беларускіх гімназіях. Першапачатковай мэтай быў кантроль палітычнай дзейнасці ўнутры. Задача па сачэнні за актыўнасцю была ўскладзена на Камандаванне акруговых карпусоў (DOK/ДОК) – орган Міністэрства ваенных спраў, які штоквартальна даваў справаздачу аб беларускім нацыянальным руху ў Заходняй Беларусі. У справаздачы за другі квартал 1928 г. указвалася, што частка навучэнцаў беларускіх гімназій у Вільні і Радашковічах знаходзяцца ў так званым «Саюзе беларускай моладзі». Дадзеную арганізацыю польскія чыноўнікі інтэрпрэтавалі як «беларускіх камсамольцаў» з прычыны таго, што «гэты саюз прымае актыўны ўдзел ва ўсім жыцці гімназій, а таксама рэагуе на знешнія падзеі, якія не маюць ніякага дачынення да адукацыі, напрыклад, працэс БСРГ, святкаванне 1 мая і г. д.». Акрамя таго, была дадзена ацэнка поглядаў і дзейнасці гімназістаў: «Большасць навучэнцаў беларускай гімназіі ў Вільні прытрымліваюцца самых левых перакананняў – яны аддаюць даніну лозунгам “Улада рабочым і сялянам”, “Зямля для працоўнага народа” і г. д. … Некаторыя настолькі пранікаюцца рэвалюцыйным духам, што здольныя на ахвяры дзеля ўяўнай ідэі» [10, арк. 12–13]. У асяроддзі навучэнцаў значнай павагай карысталіся тыя, хто знаходзіўся ў турмах за антыўрадавыя выступленні.

Падчас адсутнасці Р. Астроўскага абавязкі дырэктара выконваў настаўнік праваслаўнага Закона Божага С. Паўловіч, які спрабаваў згладзіць канфлікты ўнутры гімназіі. Аднак рознагалоссі на палітычнай глебе паміж вучнямі і выкладчыкамі хутка раслі: «Адносіны моладзі да настаўніцкага персаналу ў беларускай гімназіі ў Вільні жудаснае. Настаўнікаў, за выключэннем Івана Савіцкага, Вінцэнта Грыцкевіча і Аляксандра Міхалевіча, тых, хто карыстаецца аўтарытэтам і павагай сярод навучэнцаў, называюць “слугамі буржуазіі і капіталістаў”» [10, арк. 13]. У большай ступені педагогі падвергнуліся крытыцы з-за пасіўнай рэакцыі на разгром БСРГ. У гэты ж момант дырэктар С. Паўловіч запатрабаваў ад вучняўгурткоўцаў перадаць гімназічнай адміністрацыі рукапісы двух выдадзеных нумароў часопіса «Васілёк», на што была атрымана адмова. Рукапісы былі прымусова канфіскаваныя, што

яшчэ больш напружыла адносіны ўнутрыгімназічнага асяроддзя. Акрамя таго, супярэчнасці паміж адміністрацыяй і гімназістамі-камсамольцамі паўсталі па пытанні скаўцкага руху, арганізаванага пры ВБГ і РБГ. У адным з рашэнняў камсамольцаў скаўцкія дружыны былі названы «буржуазнымі і клерыкальнымі, яны пагражаюць рэвалюцыі і створаны для таго, каб разбіць фронт працоўных мас» [10, арк. 13]. Скаўцтва выкарыстоўвалася школьнай адміністрацыяй і кіраўніцтвам гімназій у якасці аднаго з выхаваўчых метадаў.

Тэндэнцыяй сярод навучэнцаў сталі актыўныя дыскусіі на рэлігійную тэматыку і, такім чынам, правакацыі выкладчыкаў. Асабліва крытычнае стаўленне камсамольцаў было да дзяцей духавенства і семінарыстаў. Дастатковая з іх колькасць лічылі рэлігію «ашуканствам і выдумкай дзеячоў царквы» [3, с. 133–134]. У пачатку навучальнага 1929 г. выключаныя з ВБГ у мінулым годзе вучні перайшлі ў КБГ. Іх з'яўленне падштурхнула на яшчэ большую палітызацыю ўстановы. 17 лістапада 1929 г. навучэнцы сарвалі абавязковае наведванне праваслаўнага храма ў рамках заняткаў у Клецку. Пад уплывам камуністычных поглядаў і атэістычных ідэй гімназісты адмовіліся цалаваць крыж і руку святару і выкладчыку Р. Лукашэвічу. У адказ на гэта ён запатрабаваў выключыць з гімназіі «бязбожнікаў і антыхрыстаў». Завадатараў акцыі былі вымушаны адлічыць, аднак гэта выклікала стыхійную салідарнасць з боку іншых гімназістаў. На наступны дзень вышэйзгаданыя 22 прыбыўшыя вучні зачыніліся ў навучальным кабінеце, спяваючы беларускую марсэльезу «Ад веку мы спалі», суправаджаючы выкрыкваннем антыпольскіх палітычных лозунгаў. Дырэктар гімназіі быў вымушаны выклікаць паліцыю, каб акцыя не перарасла ў нешта большае [17, с. 30]. Улады лічылі, што дадзеная палітычная акцыя была арганізавана Беларускім сялянска-рабочым пасольскім клубам (БСРПК) «Змаганне» – левацыкальнай парламенцкай фракцыяй, якая апазіцыйна ставілася да польскага ўраду. Навагрудскі ваявода ў справаздачы да Міністра ўнутраных спраў указваў, што «...група школьнікаў гімназіі ў Клецку выступіла з заявай, у якой рэзка выступае супраць “фашысцкіх нападаў на рэвалюцыйную моладзь”. Па гэтай справе БСРПК выпусціў паведамленне з пратэстам супраць выгнанняў Педагагічнай Радай вучняў гімназіі» [21, s. 26]. У выніку падзеі з гімназіі былі выключаны 22 чалавекі.

Нярэдкімі былі выпадкі наўмыснага зрыву навучальнага працэсу – урокаў, публічных выступленняў выкладчыкаў або афіцыйных мерапрыемстваў. Напрыклад, у гонар 10-годдзя незалежнасці Польшчы, 11 кастрычніка 1928 г., у ВБГ павінны былі прайсці памятныя чытанні. Большасць навучэнцаў праігнаравалі дадзенае мерапрыемства насуперак загаду адміністрацыі гімназіі. Навучэнцы пазбавіліся магчымасці праводзіць забавы і вечарынкі да канца школьнага года, што выклікала «глухое» абурэнне ў гімназістаў-камсамольцаў, якія выкарыстоўвалі гэтыя мерапрыемствы для сваіх падпольных сходаў. У другім выпадку праз некалькі дзён, 14 кастрычніка 1928 г., навучэнцы вырашылі зрабіць абструкцыю выступу Я. Станкевіча, арганізаваную віленскім аддзелам Беларускага студэнцкага саюза. У гімназічным коле Я. Станкевіч насіў рэпутацыю паланафіла і памяркоўнага дзеяча. Падчас яго прамовы ў розных частках залы навучэнцы сталі выдаваць гукі, якія выліліся ў масавае мяўканне. У справаздачах польскіх спеслужбаў гэтую акцыю назвалі «каціныя спевы». Кіраўніцтва гімназіі прыняло рашэнне адлічыць 4 вучняў – М. Таранка, М. Лукашчыка, Я. і Ф. Засімаў. Амаль праз тыдзень, 22 кастрычніка 1928 г., вучні 7 класа заявілі, што не збіраюцца наведваць заняткі да таго моманту, пакуль згаданыя гімназісты не будуць адноўлены. Педагагічны савет на пасяджэнні ў той жа дзень адмяніў рашэнне аб выключэнні, таму што не хацеў перашкаджаць працы новаму настаўніку, былому дырэктару РБГ Ф. Стэцкевічу [9, арк. 33–34].

Гісторыя са зрывам выступаў Я. Станкевіча паўтаралася не аднойчы. У наступны раз падчас пачатку прамовы ўся зала быццам па камандзе пачала кашляць, не даючы яму пачаць гаварыць. Па ўспамінах Я. Міско, Я. Станкевіч з таго моманту больш не выступаў публічна перад гімназістамі, а на наступны дзень у сценах гімназіі распаўсюджваліся выкрывальныя абразныя лістоўкі Я. Станкевічам [19, арк. 29].

Рыторыка польскіх уладаў у другой палове 1928 г. стала небяспечнай для становішча беларускай адукацыі ўвогуле. Пасля чарговай палітычнай акцыі ў Навагрудскай беларускай гімназіі (НБГ) 2 мая 1928 г. былі выключаны 4 вучня. Афіцыйнай прычынай стала невыкананне школьнай дысцыпліны і падбухторванне навучэнцаў да падобных мерапрыемстваў [7, арк. 35]. 29 жніўня 1928 г. польскімі адміністрацыйнымі органамі была спынена дзейнасць галоўнай управы ТБШ у Вільні, тым самым адрэзаўшы асноўную фінансавую дапамогу беларускім навучальным установам. Праз два дні, 31 жніўня 1928 г., улады нечакана прыпынілі дзейнасць ТБШ у Радашковічах, зачыніўшы пры гэтым гімназію. Асноўнай прычынай у справаздачы ДОК-ІІІ за трэці квартал таго ж года ўказвалася відавочная дзейнасць левацыкальных арганізацый: «...Што тычыцца беларускай адукацыі, выдатную ролю дагэтуль адыгрываюць толькі гімназіі ў Вільні і Радашковічах, якія выхоўваюць беларускую моладзь у духу камунізма, яны прадстаўляюць

у агульным беларускім руху больш сур'ёзныя фарпосты. Усё жыццё і развіццё гэтых установаў былі цалкам падпарадкаваныя камуністычным падрыўнікам з ТБШ, якія мелі канцэсіі. Кіруючыя пасады ў беларускіх гімназіях заўсёды займалі вядомыя дзеячы гэтай арганізацыі» [11, арк. 8]. Закрыццё РБГ выклікала шырокую хвалю абурэння сярод беларускіх нацыянальных мас, асабліва сярод навучэнцаў іншых гімназій.

У ліпені 1929 г. А. Уласаў накіраваў зварот да Міністра веравызнанняў і публічнай асветы з мэтай аднаўлення дзейнасці гімназіі ў Радашковічах, мяркуючы, што галоўнай прычынай такіх дзеянняў было блізкае знаходжанне да мяжы з Савецкім Саюзам. У звароце было адзначана, што геаграфічнае знаходжанне Радашковіч ніяк не ўплывае на светапогляд вучняў, прыводзячы ў прыклад Вільню, якая знаходзілася далёка ад савецка-польскай мяжы. У тым жа 1929 г. 47 вучняў РБГ падпісалі мемарыял пратэсту супраць закрыцця гімназіі і ціску беларускіх дзеячаў з боку польскіх улад [2, арк. 4–5 адв].

У тым жа жніўні 1928 г. пачалося выкрыццё і ліквідацыя вучнёўскіх падпольных камуністычных ячэек у КБГ. Органамі нясвіжскай паветовай дзяржаўнай бяспекі і клецкай паліцыяй было выяўлена 15 падпольных ячэек па 3–5 чалавек у кожнай. У выніку паліцэйскага рэйду былі арыштаваныя каля 40 чалавек, у асноўным навучэнцы 4–8 класаў, на 22 з якіх завялі крымінальную справу. Следства вялося больш за год – увесь гэты час улады спрабавалі выбіць паказанні ад падазраваных. Падчасператрусаў у іх знаходзілі лістоўкі, плакаты, чырвоныя сцягі, карыкатуры, запіскі, што станавілася відавочнай падставай для ўзмацнення жорсткасці меры стрымання [17, с. 31]. Тыя, каго паліцыя яшчэ не паспела схапіць, былі вымушаныя нелегальна перасякаць польска-савецкую мяжу і «губляцца» на тэрыторыі СССР.

З наступленнем 1928/1929 навучальнага года выступленні навучэнцаў гімназій набылі стыхійны характар. Амаль кожны месяц здзяйсняліся страйкі і акцыі. Нават даходзіла да сутыкненняў з паліцыяй. 20 снежня 1928 г. у ВБГ адбылася маштабная палітычная забастоўка. Галоўнай падставай стала аб'ява дырэктарам Р. Астроўскім аб выключэнні 22 вучняў з гімназіі за «вядзенне крамольнай працы». Сярод іх былі В. Таўлай, Я. Урбановіч, У. Шчасны, Б. Махляр, М. Тарасюк, І. Жыткевіч і іншыя. У старшых класах прайшлі кароткія акцыі пратэсту, у выніку якіх былі сарваны заняткі. Практычна ўсе навучэнцы сабраліся ў актавай зале гімназіі. З асноўнай масы была абрана дэлегацыя, якая накіравалася да дырэктара з патрабаваннем адмены загаду аб выключэнні навучэнцаў. Аднак патрабаванні не былі задаволеныя: паміж Я. Урбановічам, які агучваў патрабаванні, і Р. Астроўскім узнікла сварка, пасля чаго дэлегацыю выгналі з кабінета. Страйкоўцы не пакідалі гімназію, арганізавалі насценную газету «Рукі прэч ад гімназіі», а таксама прынялі рэзалюцыю з асуджэннем рэпрэсіўных дзеянняў польскай адміністрацыі і пазіцыі Р. Астроўскага па супрацоўніцтве з уладамі. Прыблізна ў поўдзень на перамовы прыбыў А. Луцкевіч, аднак яны скончыліся безвынікова. У другой палове дня ў гімназію ўварвалася паліцыя, якую, хутчэй за ўсё, выклікаў сам дырэктар, а зачыншчыкі былі затрыманы [6, с. 86; 19, арк. 29–30]. Гімназія пазбавілася не толькі некаторых вучняў, але і педагогаў. Было выяўлена, што настаўнік гісторыі І. Савіцкі займаў «у акцыі па падбухторванні вучняў закулісную ролю». Польскія ўлады выслалі яго праз польска-савецкую мяжу як «нязручнага замежніка» [9, арк. 35]. Праз тыдзень, 27 снежня, па падказцы старшакласнікаў адбылося выступленне сярод малодшых класаў гімназіі, якое таксама асудзіла праўладную палітыку Р. Астроўскага. Як і ў папярэдні раз дырэкцыяй была выклікана паліцыя, а акцыя скончылася затрыманнем і адлічэннем некалькіх навучэнцаў [15, с. 77]. У канцы 1928 г. дзейнасць вучнёўскіх гурткоў, часопісаў і газет спынілася. Верагодна ўлады меркавалі, што навучэнцы могуць заняць больш актыўную пазіцыю пасля калядных вакацый. Пры гэтым рабілі стаўку на працу з бацькамі, каб тыя ўплывалі на настроі сваіх дзяцей.

Наступная стыхійныя хваляванні, закрануўшыя ўсе беларускія гімназіі, адбылася 27 лютага 1929 г. і доўжылася каля месяца. Практычна штодзень навучэнцы арганізоўвалі акцыі пратэсту супраць гімназічнай адміністрацыі і палітыкі польскіх уладаў. Для падаўлення лютаўскай дэманстрацыі ў ВБГ была выклікана паліцыя. У выніку 41 гімназіст быў адлічаны з гімназіі [6, с. 86]. У сакавіку 1929 г. навучэнцы НБГ зладзілі дэманстрацыйную забастоўку супраць адлічэння навучэнцаў з ВБГ. У справаздачы аб грамадска-палітычнай сітуацыі за першы квартал 1929 г. камандаванне ДОК-ІХ пазначала: «Забастоўка мела спакойны характар; сярод настаўнікаў гімназіі ёсць вялікі роспач і асцярога з-за магчымасці закрыцця гімназіі». Сведчылася таксама і аб планавым разгроме ТБШ адміністрацыйнымі органамі, ліквідуючы акруговыя і раённыя ячэйкі, высоўваючы меркаванні выключна фармальнага характару [8, арк. 7адв]. У выніку сакавіцкіх падзей з НБГ за невыкананне школьнай дысцыпліны і падбухторванне навучэнцаў было выключана 5 вучняў 4, 7 і 8 класаў – А. Малец, І. Гарох, А. Бізюк, П. Федарко, В. Рахаў [7, арк. 35]. Па прыкладных падліках беларускага даследчыка А. М. Вабішчэвіча, за 1928/1929 навучальны год з гімназій было адлічана каля 130 чалавек [6, с. 87].

29 сакавіка 1929 г. камітэтам спраў вучняў беларускіх гімназій быў апублікаваны мемарыял навучальнай моладзі ў Вільні. Галоўнымі прычынамі яго стварэння сталі пераход часткі навучання на польскую мову і лаяльныя адносіны некаторых педагогаў гімназій да польскіх улад. Р. Астроўскага, А. Каўша, Я. Станкевіча і набліжаных да іх людзей называлі «вернымі буржуазным конунгам». Асноўнымі тэзісамі аб'яднанага мемарыяла вучняў беларускіх гімназій у Вільне, Клецку і Наваградку сталі патрабаванні барацьбы да беларускай моладзі – «барацьба за аднаўленне выгнанных вучняў; з здраднікамі Астроўскім, Коўшам і іншымі; з рэпрэсіямі і кантролем паліцыі ў сценах гімназій; барацьба з "камедыяй" па справе Грамады; супраць фашызацыі школ, вайны з СССР і фашысцкага ўраду», завяршаючы палітычнымі заклікамі: «Няхай будзе салідарнасць барацьбы вучняў беларускіх гімназій і іншых; няхай будзе з'яднанне Заходняй Беларусі і Савецкай Беларусі; няхай будзе сацыялізм і вызваленне палітычных вязняў; няхай будзе барацьба да перамогі» [12, арк. 122]. Дакумент выклікаў асаблівую цікавасць у польскіх спецслужбаў, таму насіў у абароце польскай дзяржаўнай паліцыі грыф сакрэтнасці.

Улетку 1929 г. польская паліцыя затрымала 26 чалавек з ВБГ, якія ўдзельнічалі ў папярэдніх акцыях і дэманстрацыях. Амаль усе затрыманыя былі дзеючымі функцыянерамі БСРКП і Віленскага аддзялення Польскай сацыялістычнай партыі – Левіцы (ППС–Левіца), актыўнымі членамі камсамольскіх арганізацый і камітэтаў КПЗБ. 10 чалавек былі абвінавачаныя па артыкулах 102 або 129 Крымінальнага кодэкса за антыдзяржаўную дзейнасць і былі памешчаны ў Лукішскую турму ў Вільні [7, арк. 26–26адв].

Восенню 1929 г. польская адміністрацыя пачала супрацьдзеянне палітычнай актыўнасці ў сценах беларускай гімназіі ў Клецку. 18 лістапада 1929 г. у КБГ прайшла дэманстрацыя навучэнцаў, у выніку якой адлічаны 31 навучэнец. 5 чалавек з гэтага ліку, І. Міско, А. Шыдлоўскі, У. Шчасны, У. Мазоль і І. Шыцік, былі выгнаны яшчэ ў пачатку лістапада 1929 г. па прычыне дэзарганізацыйнага ўплыву на аднакласнікаў [7, арк. 145]. У 1931 г. дзейнасць беларускай гімназіі ў Клецку спынілася. Школьныя ўлады не працягнулі канцэсію на далейшую працу гімназіі на падставе выкрыцця польскай паліцыяй падпольных камуністычных ячэек ва ўстанове.

У 1929 г. з-за вялікай палітычнай актыўнасці з'явілася пагроза закрыцця і НБГ. Пасля некалькіх забастовак у 1929 г. школьныя ўлады ўмяшаліся ў дзейнасць гімназіі, патрабуючы ад дырэкцыі спыніць актыўнасць камсамола, або гімназія будзе зачынена. Таму асноўных заватараў акцый было вырашана адлічыць. У сакавіку 1932 г. у Навагрудскім павеце здарылася ўзброенае сутыкненне мясцовых сялян з польскай паліцыяй. Адным з актыўных удзельнікаў быў навучэнец НБГ А. Малец, які з яшчэ некалькімі людзьмі быў арыштаваны. У пачатку ліпеня 1932 г. судовым прысудам ён быў павешаны. Гэтая падзея выклікала вялікі рэзананс сярод кантынгенту гімназіі, што прывяло да адлічэння яшчэ некалькіх палітычна актыўных вучняў – У. Гуля, І. Гароха, Я. Бізюка, В. Бахара і іншых [20, с. 57]. Аднак гэта ніяк не палепшыла сітуацыю ў адносінах польскіх улад да ўстановы. У пачатку лета 1934 г. пастановай кураторыюма НБГ была зачынена.

Некаторыя польскія чыноўнікі разумелі трагічнасць сітуацыі з беларускімі гімназіямі. Як адзначалася ў адміністрацыйных справаздачах, палітычныя сілы, не маючы магчымасць адкрыта рабіць сваю дзейнасць на вуліцах, заваблівалі падлеткаў пад свой уплыў [22, s. 253]. У другой палове 1930-х гг. беларуская адукацыя фактычна была ўзята пад кантроль польскімі ўладамі. Напрыклад, у 1932 г. ВБГ была рэарганізавана ў філіял Віленскай дзяржаўнай гімназіі імя Ю. Славацкага.

*Заключэнне.* Такім чынам, палітычную актыўнасць вучняў беларускіх гімназій можна падзяліць на два этапы. У першым этапе (1919–1927 гг.) актыўнасць гімназістаў абмяжоўвалася дзейнасцю арганізацый, выпускам часопісаў і газет, наладжваннем выхаваўчых мерапрыемстваў з акцэнтам на нацыянальнае адраджэнне. Левrouteрадыкальныя ідэі не былі распаўсюджаны ў гімназічным асяроддзі, але паступова пачыналі пранікаць. Другі этап (1927–1933 гг.) характарызуецца палітызацыяй актыўнасці, нарастаннем шырокай папулярнасці левардыкальных ідэй, узнікненнем падпольных камсамольскіх ячэек у сценах гімназій. Пасля разгрому БСРГ у 1927 г. адбываецца пераход да актыўнай фазы, калі дзейнасць вучняў накіроўвалася ў бок супрацьстаяння з польскімі ўладамі. Формамі такой актыўнасці сталі зрывы навучальнага працэсу, мітынгі, забастоўкі, распаўсюджванне камуністычных ідэй, сутыкненні з паліцыяй і г. д. Пры гэтым назіраўся высокі ўзровень нацыянальнай свядомасці навучэнцаў. Асноўным кантынгентам з'яўляліся прыезджыя вучні, выхадцы з сялянскіх сямей, якія пражывалі ў інтэрнатах, дзе адбывалася «бражэнне» поглядаў. Карыстаючыся такім становішчам, польскія адміністрацыйныя органы стрымлівалі палітычную і нацыянальную актыўнасць, што стала падставай для масавых адлічэнняў. Асноўным метадам для іх сталі палітычныя правакацыі вучняў з мэтай выкрыцця падпольнай дзейнасці. Акрамя таго, пасля палітычнага раскола ў беларускім нацыянальным асяроддзі беларускія гімназіі сталі месцам сутыкнення бакоў,

дзе вялася своеасаблівая «барацьба за розумы». Пасля 1934 г. з чатырох гімназій працягвала дзейнічаць толькі Віленская, але ў якасці філіяла польскай навучальнай установы. Такая сітуацыя сведчыла аб тым, што польскія ўлады ўзялі пад жорсткі кантроль моладзевыя рухі ў сценах беларускіх навучальных устаноў.

### Літаратура і крыніцы


1. Арышт вучняў Віленскае Беларускае Гімназіі // Наперад. – 1929. – № 1. – С. 4.
2. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і музей (БДАМЛіМ). – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 21.
3. *Бурсевіч, І.* Віленская беларуская гімназія / І. Бурсевіч // Маладосць: штомесячны літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны ілюстраваны часопіс. – 2011. – № 4. – С. 136–141.
4. *Бурсевіч, М. В.* Уступаючы ў жыццё… / М. В. Бурсевіч // У суровыя гады падполля: успаміны былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі / Інстытут гісторыі партыі ЦК КП Беларусі. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1958. – С. 133–141.
5. *Вабішчэвіч, А. М.* Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2004. – 116 с.
6. *Вабішчэвіч, А. М.* Беларускія гімназіі ў культурна-асветніцкім і грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі (1920–1930-я гг.) / А. М. Вабішчэвіч // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2002. – № 18. – С. 78–90.
7. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 1323.
8. ДАБВ. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 1211.
9. ДАБВ. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 1232.
10. ДАБВ. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 940.
11. ДАБВ. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 941.
12. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 20. Воп. 1. Спр. 8.
13. *Коўш, З.* Віленская гімназія / З. Коўш // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 1. – С. 34–36.
14. *Ляхоўскі, У. В.* Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.) / У. В. Ляхоўскі. – 2-е выд. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 480 с.
15. *Ляхоўскі, У. В.* Маладзёвы рух паміж дзвюмя войнамі (1921–1939 гг.) / У. В. Ляхоўскі // Спадчына. – 2012. – № 161. – С. 3–115.
16. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945) / пад рэд. Г. Р. Сянькевіча [і інш]. – Мінск : Народная асвета, 1993. – 495 с.
17. *Сокал, В.* Клецкая гімназія / В. Сокал // Беларуская мінуўшчына. – 1994. – № 4. – С. 28–31.
18. Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Аддзел рэдкай кнігі і рукапісаў (ЦНБ НАНБ. АРКР). – Ф. 35. Воп. 1. Спр. 94.
19. ЦНБ НАНБ. АРКР. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 64.
20. *Чэмер, А.* Наваградская беларуская гімназія / А. Чэмер. – Вільнюс : UAB «Saverenas», 1997. – 133 с.
21. Sprawozdanie z życia mniejszości narodowych za październik, listopad i grudzień 1929 r. – Warszawa : Wydział narodowościowy, 1930. – 140 s.
22. *Wysłouch, S.* Białorusini na Ziemi Wileńskiej / S. Wysłouch // Wilno i Ziemia Wileńska: zarys monograficzny: w 2 t. – Wilno : Wydawnictwo wojewódzkiego komitetu regjonalnego, 1930. – T. 1. – S. 250–261.


### References


1. Arysht vuchnyaū Vilenskae Belaruskae Gimnazii // Naperad. – 1929. – № 1. – S. 4.
2. BDAMLiM. – F. 3. Vop. 1. Spr. 21.
3. *Bursevich, I.* Vilenskaya belaruskaya gimnaziya / I. Bursevich // Maladosc': shtomesyachny litaraturna-mastacki i gramadska-palitychny ilyustravany chasopis. – 2011. – № 4. – S. 136–141.
4. *Bursevich, M. V.* Ustupayuchy ū zhyccyo… / M. V. Bursevich // U surovyya gady padpollya: uspaminy bylyh chlenaū KPZB – aktyūnyh udzel'nikaū revalyucyjnaga ruhu ū Zahodnyaj Belarusi / Instytut gistoryi partyi CK KP Belarusi. – Minsk : Dzyarzhaūnae vydavectva BSSR, 1958. – S. 133–141.
5. *Vabishchevich, A. M.* Asveta ū Zahodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) / A. M. Vabishchevich. – Brest : Vyd-va BrDU, 2004. – 116 s.
6. *Vabishchevich, A. M.* Belaruskiya gimnazii ū kul'turna-asvetnickim i gramadska-palitychnym zhycci Zahodnyaj Belarusi (1920–1930-ya gg.) / A. M. Vabishchevich // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2002. – № 18. – S. 78–90.
7. Dzyarzhaūny arhiū Bresckaj voblasci (DABV). – F. 1. Vop. 9. Spr. 1323.
8. DABV. – F. 67. Vop. 1. Spr. 1211.
9. DABV. – F. 67. Vop. 1. Spr. 1232.
10. DABV. – F. 67. Vop. 1. Spr. 940.
11. DABV. – F. 67. Vop. 1. Spr. 941.
12. Dzyarzhaūny arhiū Grodzenskaj voblasci (DAGV). – F. 20. Vop. 1. Spr. 8.
13. *Koūsh, Z.* Vilenskaya gimnaziya / Z. Koūsh // Belaruskaya minuūshchyna. – 1995. – № 1. – S. 34–36.
14. *Lyahoūski, U. V.* Ad gomanaūcaū da gajsakoū. Chynnasc' belaruskih maladzyovyh arganizacyj u 2-j palove XIX st. – 1-j palove XX st. (da 1939 g.) / U. V. Lyahoūski. – 2-e vyd. – Smalensk : Inbelkul't, 2015. – 480 s.
15. *Lyahoūski, U. V.* Maladzyovy ruh pamizh dzvyumya vojnami (1921–1939 gg.) / U. V. Lyahoūski // Spadchyna. – 2012. – № 161. – S. 3–115.
16. Narodnaya adukacyya i pedagagichnaya navuka ū Belarusi (1917–1945) / pad red. G. R. Syan'kevicha [i insh]. – Minsk : Narodnaya asveta, 1993. – 495 s.
17. *Sokal, V.* Kleckaya gimnaziya / V. Sokal // Belaruskaya minuūshchyna. – 1994. – № 4. – S. 28–31.
18. Nacyyanal'naj akademii navuk Belarusi. Addzel redkaj knigi i rukapisau (CNB NANB. ARKR). – F. 35. Vop. 1. Spr. 94.
19. CNB NANB. ARKR. – F. 1. Vop. 1. Spr. 64.
20. *Chemer, A.* Navagradskaya belaruskaya gimnaziya / A. Chemer. – Vil'nyus : UAB «Saverenas», 1997. – 133 s.
21. Sprawozdanie z życia mniejszości narodowych za październik, listopad i grudzień 1929 r. – Warszawa : Wydział narodowościowy, 1930. – 140 s.
22. *Wysłouch, S.* Białorusini na Ziemi Wileńskiej / S. Wysłouch // Wilno i Ziemia Wileńska: zarys monograficzny: w 2 t. – Wilno : Wydawnictwo wojewódzkiego komitetu regjonalnego, 1930. – T. 1. – S. 250–261.